Источник: "Лiтаратура i мастацтва" - 2013-02-22

# Пункцірам

✔ Перспектывы беларуска-французскіх культурных сувязей былі абмеркаваны на сустрэчы Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла Беларусі ў Францыі Паўла Латушкі з дырэктарам Нацыянальнай кансерваторыі «Гранд Нансі» Жанам-Філіпам Наварам. Улічваючы актыўнае супрацоўніцтва ў арганізацыі культурных мерапрыемстваў, вырашана, што на міжнародным фестывалі кансерваторый Францыі, Бельгіі і Германіі, які сёлета пройдзе ў горадзе Нансі (Францыя), дырыжыраваць аркестрам кансерваторыі будзе народны артыст Беларусі Міхаіл Казінец.

✔ Мініяцюрная «Жалейка» Янкі Купалы, што пабачыла свет у Баку і ўзнаўляе выданне 1908 года, была прэзентавана ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі. Кніга памерам 35 на 47 мм была перададзена галоўнай кніжніцы Беларусі ў сувязі з 20-годдзем усталявання дыпламатычных адносін паміж краінамі.

✔ У літоўскім горадзе Друскінінкай праходзіць выстаўка «Шляхамі Якуба Коласа», якая прадстаўляе фотаматэрыялы з фондаў беларускага Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа.

✔ Нацыянальны гістарычны музей Беларусі распачаў праект «Партыя — правадыр Кастрычніка», прымеркаваны да 115-годдзя правядзення І з'езда Расійскай сацыял-дэмакратычнай рабочай партыі і 90-годдзя з дня адкрыцця Дома-музея І з'езда РСДРП. Распачаўся праект выстаўкай плакатаў «Назаўжды». Яшчэ адзін праект музея — цыкл выставак «Першыя», які адкрыўся экспазіцыяй мемарыяльных рэчаў Кузьмы Кісялёва.

✔ На гэтым тыдні ў Мінску прайшоў трэці фестываль кароткаметражнага айчыннага кіно *One Short Film Fest*. Традыцыйна ўдзельнічаюць у ім не толькі студэнты творчых спецыяльнасцей, але і непрафесійныя рэжысёры.

✔ Праект «Адам Міцкевіч і тэатр» стартаваў у Навагрудку. Прымеркаваны ён да 215-годдзя з дня нараджэння паэта і 75-годдзя з дня адкрыцця домамузея ў раённым цэнтры. У межах праекта музей прадставіць пляцоўку для выступлення тэатральным калектывам, якія прапануюць пастаноўкі па матывах твораў ураджэнца Навагрудчыны.

✔ Да Міжнароднага дня роднай мовы, які ва ўсім свеце адзначаецца 21 лютага, запрасілі спрычыніцца ўстановы культуры. Праграма Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Якуба Коласа НАН Беларусі распачалася відэафільмам пра цікавыя звесткі з розных моў, пасля — прэзентацыі кніжных экспазіцый і паэтычныя чытанні. Літаратурная вечарына, на якую завіталі літаратары розных нацыянальнасцей, якія жывуць і працуюць у Беларусі, ладзілася ў музеі Якуба Коласа. А музей Янкі Купалы запрашае на «Ноч беларускай літаратуры», пачатак сёння а 19-й гадзіне. З 21 па 27 лютага самыя розныя імпрэзы і сустрэчы праходзяць на філалагічным факультэце БДУ.

**Падрыхтавала**
**Таццяна МАСТОЎСКАЯ**

Таццяна Мастоўская. Пункцірам